Гардзееў Б. П.

# АБ ІМ ХАДЗІЛА ЛЕГЕНДА

На паўвостраве Ханка ў Фінляндыі ёсць магіла лётчыка, Героя Савецкага Саюза капітана А. К. Антоненкі, аб якім там ходзіць легенда: быццам ён, ужо мёртвы, прывёў свой знішчальнік на аэрадром і пасадзіў яго "на ўсе кропкі".

Капітан Аляксей Касьянавіч Антоненка нарадзіўся 23 лютага 1911 г. у вёсцы Васькавічы Слаўгарадскага раёна ў сям'і селяніна-бедняка.

У Чырвоную Армію быў прызваны ў 1929 г. і накіраваны ў Ейскую школу марскіх лётчыкаў. Пасля заканчэння школы некалькі гадоў служыў там лётчыкам-інструктарам. Удзельнік баёў на рацэ Халхін-Гол. У небе Манголіі збіў 6 японскіх самалётаў, за што быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Пасля савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг. прызначаны на пасаду намесніка эскадрыллі 13-га знішчальна-авіяцыйнага палка 61-й брыгады ваенна-паветраных сіл Балтыйскага флоту. Галоўнай задачай брыгады было прыкрыццё савецкай ваенна-марской базы на паўвостраве Ханка і блізкіх подступаў да Ленінграда. Тут капітана і застала вайна.

...Эпапея Ханка – вядомая старонка гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гітлераўцы з першых дзён нападу на СССР імкнуліся, чаго б гэта ні каштавала, знішчыць важны аб'ект базіравання савецкага флоту. Яны спрабавалі блакіраваць яго з мора і паветра, а фіны бесперапынна атакавалі абаронцаў базы з сушы. Але ўсе спробы ворага разбіваліся аб бяспрыкладную мужнасць савецкіх маракоў, лётчыкаў і марскіх пехацінцаў. Яны змагаліся з фашыстамі да апошняй магчымасці. І толькі па загадзе камандавання пачалі эвакуацыю караблёў і асабовага складу.

Аб напружанасці баявой абстаноўкі на паўвостраве сведчыць такі факт: за першыя 34 дні вайны капітан А. К. Антоненка зрабіў больш за 100 баявых вылетаў, правёў 42 паветраныя баі, у якіх збіў 11 фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў.

Дзень 26 ліпеня 1941 г. выдаўся для лётчыкаў асабліва цяжкім. Двойчы ўзнімаліся ў паветра ўсім палком – адбівалі масіраваныя налёты авіяцыі праціўніка. Увесь час, змяняючы адзін аднаго, неслі ў паветры патрульную службу звенні МІГаў.

...Растлумачыўшы двум сваім вядзёным задачу, капітан Антоненка моцна паціснуў ім рукі, хутка забраўся ў кабіну знішчальніка, закрыў ліхтар. І тут жа ў неба ўзвілася сігнальная ракета. Тры матора зараўлі адначасова, і самалёты пачалі вырульваць на ўзлётную паласу.

На трэцім крузе, калі знішчальнікі былі над варожай тэрыторыяй, капітан заўважае фінскі эшалон. Падае сігнал вядзёным: атакаваць! Звяно імкліва пікіруе на цэль. Знішчальнікі праносяцца над эшалонам адзін раз, потым другі. Антоненка, які заставаўся для прыкрыцця таварышаў на значнай вышыні, выразна бачыў, як бліскучыя маланкі пранізваюць таварныя вагоны і ахутаны парай паравоз. Бачна, як магутны выбух скідае з насыпу састаў.

Задача выканана. МІГі ляглі на зваротны курс. Раптам, глянуўшы ўніз, удалечыні, на шашы капітан заўважыў ваенную аўтамашыну. Не вяртацца ж дамоў з нерасходаваным боезапасам. Ён плаўна разварочвае самалёт. І вось ужо ў цэнтры павуцінападобнай сеткі прыцэлу добра відаць цэль. Лётчык націскае на гашэтку, ахопленая полымем аўтамашына перакульваецца ў кювет. Антоненка дае яшчэ некалькі чэргаў па матацыклісце...

Аляксей Касьянавіч адчуў рэзкі ўдар у левы бок. Грудзі працяў пякучы боль. Стала цямнець у вачах, навальвалася слабасць. Пераляцеўшы лінію фронту, лётчык з вялікай цяжкасцю правёў самалёт на сніжэнне. Разам з ударам шасі аб зямлю роднага аэрадрома капітан Антоненка страціў прытомнасць. Да знішчальніка падбеглі баявыя сябры капітана, адкінулі ліхтар... Лётчык быў мёртвы.

**Гардзееў, Б. П. Аб ім хадзіла легенда // Б. П. Гардзееў / Памяць : Слаўгарадскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкалегія: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 1999. — С. 242—243.**